Инфармацыйнае паведамленне аб мерапрыемствах у межах Дзён славянскага пісьменства і культуры-2022




**Паважаныя аматары славянскага пісьменства!**

**Шаноўныя студэнты і выкладчыкі!**

Філалагічны факультэт запрашае УСІХ, хто цікавіцца гісторыяй узнікнення і развіцця славянскага пісьма, славянскімі мовамі і літаратурамі, далучыцца да святкавання **Дня славянскага пісьменства і культуры**, які адзначаецца ў славянскіх краінах 24 мая і прысвячаецца памяці СВЯТЫХ РОЎНААПОСТАЛЬНЫХ МЯФОДЗІЯ І КІРЫЛА.

У Праграме мерапрыемства:

- літаратурна-музычная кампазіцыя “Спачатку было СЛОВА” (25.05.2022, 13.30 – 15.00, Ажэшкі, 22, ауд. 218);
- інтэлектуальная гульня “Іду на ВЫ: Па слядах Кірыла і Мяфодзія” (25.05.2022, 15.20 – 16.20, Ажэшкі, 22, ауд. 218а);
- сумесная выстава «Святло славянскай кнігі», арганізаваная навуковай бібліятэкай ГрГУ і абласной бібліятэкай імя Я.Ф. Карскага (23.05.2022 – 25.05.2022, Ажэшкі, 22, чытальная зала);
- інтэрактыўная графічная майстэрня (24.05.2022 – 25.05.2022, 13.00 – 13.30, 15.00 – 16.45, Ажэшкі, 22, чытальная зала);
- а таксама **ШЭРАГ ЦІКАВЫХ КОНКУРСАЎ**. **Прыняць удзел у конкурсах МОЖА КОЖНЫ!** Пераможцы будуць узнагароджаны дыпломамі філалагічнага факультэта і прызамі ад прафкама студэнтаў і БРСМ.

Актуальную інфармацыю пра конкурсы: глядзі нашу групу ў кантакце (ВК) “Дні славянскага пісьменства-2022” (Станілка Данііл/Хадароўская Ангеліна ГрДУ).

## <u>ТВОРЧЫ БЛОК КОНКУРСАЎ</u>

- ✓ графічны конкурс каліграфіі і сэнсаў “Прыгожа літары выводзіць ён пяром”

**Умовы:** удзельнікам прапануецца за вызначаны час напісаць фразу (словы) кірылічнымі літарамі. Улічваецца прыгажосць напісання і хуткасць выканання.

**Месца і час правядзення:** 24.05.2022 – 25.05.2022, 13.00 – 13.30, 15.00 – 16.45, Ажэшкі, 22, чытальная зала

**Дадатковая інфармацыя:** Шыш Ганна anna.shish.03@mail.ru

- ✓ конкурс “Майстар сінквейна 2 - 7/8 – за 24 – да 24”

**Час правядзення**: да 24 мая 2022 г.

**Заданне**. Вам прапануецца асаблівы фармат сінквейна: **2 - 7/8 – за 24 – да 24.**

Не зразумела? Гляньце тлумачэнне лічбаў:

**2 –** сінквейна павінна быць ДВА;

**7/8** – такую частку сінквейна Вы запаўняеце самастойна, паколькі 1/8 частка – абавязковая для ўсіх;

**за 24 –** напісаны яны павінны быць за суткі (24 гадзіны адлічваюцца ВАМІ з моманту прачытання задання);

**да 24 –** прысвячаюцца да даты 24 мая.

<table>
<tr><td colspan="6">ПАМЯЦЬ</td></tr>
<tr><td colspan="3"></td><td colspan="3"></td></tr>
<tr><td colspan="2"></td><td colspan="2"></td><td colspan="2"></td></tr>
<tr><td colspan="6"></td></tr>
<tr><td colspan="6"></td></tr>
</table>

<table>
<tr><td colspan="6"></td></tr>
<tr><td colspan="3"></td><td colspan="3"></td></tr>
<tr><td colspan="2"></td><td colspan="2"></td><td colspan="2"></td></tr>
<tr><td colspan="6">СПАЧАТКУ БЫЛО СЛОВА</td></tr>
<tr><td colspan="6"></td></tr>
</table>

**Заўвагі.**

1. Мова выканання: беларуская альбо руская.
2. Афармленне ўлічваецца.
3. Прадугледжана 2 формы выканання:
   - у папяровым варыянце (здаць на кафедру **рускай філалогіі** да 21 мая 2022 года);
   - даслаць на адрас электроннай пошты Макей Златы да 24 мая. goldy.mak@inbox.ru
4. Падпішыце работу: Выканаў(ла)____________________________(курс, спецыяльнасць).
5. Дапускаецца 2 выканаўцы.

- ✓ творчы конкурс “Славянскі фестываль”

Прыгожа выконваеце славянскія песні? Можаце прачытаць верш на адной з заходне- альбо паўднёваславянскіх моў альбо станцаваць народны танец?

Дашліце сваю заяўку і відэаролік – і мы запросім ВАС да ўдзелу ў Літаратурна-музычнай кампазіцыі “Спачатку было СЛОВА”, якая адбудзецца 25.05.22, Ажэшкі, 22, ауд. 218.

**Заўвага.** Заяўкі пакідаем у групе ў кантакце “Дні славянскага пісьменства-2022” (Станілка Данііл/Хадароўская Ангеліна ГрДУ) да 21 мая.

✓ літаратурны конкурс “Проба пяра”

**Час правядзення**: да 21 мая 2022 г.
**Тэматычнае абмежаванне вершаў:**
а) лёс беларускай / рускай мовы;
б) прысвячэнне Дню славянскага пісьменства, Кірылу і Мяфодзію;
в) год гістарычнай памяці.
**Заўвагі.**
1. Мова выканання: беларуская альбо руская.
2. Прадугледжана 2 формы выканання:
    - у папяровым варыянце (здаць на **кафедру рускай філалогіі** да 21 мая 2022 года);
    - даслаць на адрас электроннай пошты Някрэвіч Кацярыны Nekrevich_EA_21@student.grsu.by да 24 мая.

✓ творчы конкурс “Гаваркая літара”

**Умовы:** удзельнікі дэманструюць літару стараславянскай кірыліцы, зробленую сваімі рукамі. Літара можа быць намаляваная, вышытая, выразаная, выпечаная ці выкананая любым іншым спосабам. У час прэзентацыі неабходна паказаць, якое месца займае літара ў стараславянскім алфавіце, які сэнс укладваюць у яе. Улічваецца прыгажосць выканання і крэатыўнасць прадстаўлення.
**Месца і час правядзення:** 25.05.2022, 14.00 – 15.00, Ажэшкі, 22, ауд. 218.
**Дадатковая інфармацыя:** Шкуратава Паліна Shkuratova_PS_21@student.grsu.by

## ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫ БЛОК КОНКУРСАЎ

✓ Супергульня “Іду на ВЫ: Па слядах Кірыла і Мяфодзія”

**Умовы:** удзельнічаць можа 4 каманды па 6 чалавек: выкладчыкі, студэнты розных спецыяльнасцей, абітурыенты, іншыя аматары славянскага пісьменства і знаўцы яго гісторыі.

Студэнты спецыяльнасцей «Руская філалогія» і «Беларуская філалогія» уключаюцца ў склад каманд неславістычных спецыяльнасцей.

**Месца і час правядзення:** 25.05.2022, 15.20 – 16.20, Ажэшкі, 22, ауд. 218а.
**Заўвагі.**
1. Заяўкі падаваць Ляскевіч Святлане Георгіеўне leskevich_sg@grsu.by.
2. Пры перавышэнні колькасці заявак права ўдзелу маюць тыя, хто першым зарэгістраваўся.
3. Магчымая карэкціроўка складу каманд на старце гульні.

✓ Анлайн-алімпіяда па стараславянскай мове

**Умовы:** удзельнічаць можа кожны, хто жадае праверыць свае веды па гісторыі развіцця славянскага пісьменства і яго спадчыне ў сучасных рускай і беларускай мовах.

**Заўвагі.**

1. Алімпіяда адкрыта да 24 мая ўключна, разлічана на 40-50 хвілін.
2. Прадугледжаны выбар мовы выканання (руская/беларуская).3. Для адкрыцця анкеты не з мабільнай прылады (гэта значыць з кампутара / наўтбука) выкарыстоўвайце апошнія версіі браўзэраў Chrome, Firefox, Microsoft Edge.
3. Доступ магчымы:

праз QR-код пры інфармацыйнай падтрымцы часопіса “Роднае слова”/ праз спасылку

беларускі варыянт: https://forms.gle/vCcoaU3nhPCdYDzP6

рускі варыянт: https://forms.gle/xT63p1suRjggAVJx6